# [У. Дубоўка.] „Дзяўчына“

Дзяўчына дала волю двум пачаткам, што пратэндавалі на ўладу над ёю змагацца самім у форме спаборніцтва. Каторы акажацца мацней, таму падуладна стану і я, — так[і] сэнс дзяўчынінай задачы. Уласна гэта значыць, што ёю ўжо аўладалі абудва гэтыя пачаткі, яны над ёю пануюць ужо, а не яна над імі. Панаваньне гэта канчаецца сьмерцю. Падзеі адбыліся. Факт зьдзейсьніўся. Што гэта сьмерць значыць? Гэта знач[ыць] сьмерць уладаньня двух пач[аткаў] над дзяўчынаю. А сьмерць гэтых уладаньня[ў] азначае сьмерць і самой дзяўчыны, бо гэтыя ўладаньні ў ёй самой, у яе нутры. І ўсё ўмірае, а ўсё гэта пераходзіць з рэальнага быцьця ў ідэальнае — становіцца сьвядомасьцю людзей, перажытае ўсьведамляецца нашчадкамі як навука сваіх продкаў для нашчадкаў. Але што значыць усьвядоміць? Гэты процэс можна разглядаць і як станаўленьне пазытыўнага, і як адмаўленьне нэгатыўнага. З апошняга п[ункту] гледжаньня — усьведамленьне ёсьць адмаўленьне несьвядомасьці. А сьвядомасьці процілегласьць ёсьць рэальнае быцьцё, дзейснасьць. Значыць, усьвядоміць што–небудзь — адмовіць дзейснасьць. *Але дзейснасьць* дадзеная нам у адчуваньнях. Значыць, адмовіць дзейснасьць азначае адмовіць яе такую, якою яна дадзена ў адчуваньнях нашых, непасрэдна дадзена нам, або тую, якою яна нам прадстаўляецца. Іначай кажучы, гэта азначае зрабіць тое самае, што зрабіў той, хто першы адмовіў, што сонца ўсходзіць і заходзіць, а ўстанавіў процілеглае: паварот зямлі то адным, то другім бокам да сонца. Ото–ж і дзеяпесьня „Дзяўчына“ ёсьць нішто іншае, як усьведамленьне сябе як нацыі ў палажэньні падуладнасьці і зах[аду], і ўсх[оду]. Што адбылося — ці дзяцюкі і дзяўчына, якая здалася на іх сусьцігі, памерлі, ці памерла процілеглае гэтых падзей, — гэта несьвядомасьць сябе, свайго палажэньня ў сьвеце. Менавіта памерла другое, аб тым–жа, што жыве першае (толькі ў іншым ужо становішчы), гавораць дубы і бярозы між імі. Адчуваньне выхаду бел[арусаў] як нацыі на міжнар[одную] сцэну — пасьляваен[ны] курган — перайшло ў сьвядомась[ць], будучы адмоўленае як адчуваньне і прызнанае як сапраўдная падзея. Памерла несьвядомасьць, памерла пасыўнасьць, бязмэтнасьць, памерла падпарадкаванась[ць] выпадку і сусьцігу, памерла падуладнась[ць]. То–ж „дзяўч[ына]“ была задачаю для „дзяцюкоў“: хто першы здолее дабегчы **ад і да**, таго і будзе „дзяўч[ына]“ (б) Ці ня так разважа[ла] старая Бел[арусь]? Яна вось і памерла, г. зн. памяткаю аб ёй — „**дубы і бярозы між імі** на кургане“ ды **песьня ў людзях**. Яе ўжо няма, ёсьць толькі памятка аб ёй. Памяць аб ёй жыве. У процілежнасьць ёй жыве новая Бел[арусь], якая ўжо ведае патрэбы, свае інтарэсы — гэта ўсьведамленьне (у галін[е] ідэол[ёгічнай]) свае мэты жыцьця, патрэба вызначэньня адзінай мэты — „жыцьцю — дай адну ты мэту, адну — бо і сам адзіны“. Адну можна разглядаць як колькаснае азначэньне, а такжа і як якаснае ў сэнсе аднэй з некім, у сэнсе адзінства асобы з нацыяй, з народам. Ото–ж песьня з выслоўем „жыцьцю адну ты мэту дай“ укладзена ў [вусны] прадст[аўніка] ад народу — у вусны лірніка. Адначасна гэты зварот „жыцьцю дай адну ты мэту“ ўкладзены у вусны нар[однае] песьні — ці ня ёсьць гэта зваротам таго пачатку развагі ў поэты, які поруч з пач[аткам] пачуцьця такую вялікую ролю грае ў разьв[іцьці] Дуб[оўкавай] поэзіі, і якія адзіны ў тым, ад каго і словы „чуў, ах колькі чуў я, як шуміць трысьцё“. Гэта азначае народны загад, падан[ы] у разуменьні ў развазе самога поэты, як зразумеў ён патрэбу народу і яго інтарэс у вызначэньні адзінства мэты жыцьця.

*[1932]*